# ПАРОНІМЫ
# і амонімы

МОВА
НАНОВА

МАГІЛЁЎ

# СВИДЕТЕЛЬСТВО

о государственной регистрации юридического лица

Мінскім гарвыканкамам

**27 лістапада 2014 г.** у Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў унесены запіс аб дзяржаўнай рэгістрацыі

**Сацыяльна-культурнай ўстановы развіцця беларускай мовы і культуры "Мова Нанова" (Установы "Мова Нанова")**

з рэгістрацыйным нумарам **192385028**

Намеснік начальніка
галоўнага ўпраўлення
юстыцыі Мінгарвыканкама

А.С.Маісеенка

0101197

МОВА
НАНОВА
МАГІЛЁЎ

# ПАРОНІМЫ

***Паронімы*** *(ад грэч. para – побач, блізка і onyma – імя) – гэта аднакаранёвыя словы, блізкія, але не тоесныя сваім гучаннем і напісаннем і розныя па значэнні.*

*Напр.: чарнець 'станавіцца чорным, чарнейшым' і чарніць 'рабіць што-небудзь чорным, чарнейшым'.*

# МІЖМОЎНЫЯ АМОНІМЫ

*Міжмоўныя амонімы – словы з розных моў, якія поўнасцю або часткова супадаюць у гучанні, але маюць рознае лексічнае значэнне.*

*Напрыклад, у беларускай мове слова язык мае значэнне 'рухомы мышачны орган у ротавай поласці пазваночных жывёл і чалавека', а у рускай мове - 'сукупнасць агульнапрынятых гукавых і лексікаграфічных сродкаў для выказвання думак і наладжвання сувязі паміж людзьмі'.*

1. Абрад шлюбу і ўрачыстасць, святкаванне, звязанае з гэтым - **вяселле**
2. Радасць, радасны настрой - **весялосць**
3. Палявая кветка - **краска**
4. Рэчыва, што надае той ці іншы колер прадметам, якія яно пакрывае - **фарба**

МОВА НАНОВА
МАГІЛЕЎ

1. *Парадкавы лічэбнік, утвораны ад два. Той, хто ідзе пасля першага -* **другі**

2. *Не такі, як усе; той, хто адрозніваецца ад астатніх -* **іншы**

3. *Даць жыццё каму-н. шляхам родаў -* **нарадзіць**

4. *Адзець прыгожа, лепш, чым звычайна -* **прыбраць**

1. *Сінонім да слоў смутак, маркота, журба -* ***жаль***
2. *Пачуццё шкадавання. Пра нежаданне аддаць, страціць што-н. -* ***шкада***
3. *Сёмы дзень тыдня, агульны дзень адпачынку -* ***нядзеля***
4. *Сямідзённы прамежак часу -****тыдзень***

МОВА НАНОВА
МАГІЛЕЎ

1. Той, хто валодае вызначанымі дадатнымі якасцямі, якія неабходныя або для выканання той або іншай працы або для вылучэння яго з серады іншых людзей - **годны**

2. Прыгодны, патрэбны для пэўных мэт, што мае патрэбныя для чаго-н. якасці -**прыдатны**

1. Прадмет мэблі, звычайна са спінкай, прызначаны для сядзення аднаго чалавека - **крэсла**

2. Камфартабэльны прадмет мэблі для сядзення чалавека, з ручкамі для ўпора локцяў - **фатэль**

1. *Паняцце колькасці, велічыня, пры дапамозе якой праводзіцца лічэнне. Вынікі гульні, выражаныя ў лічбах -* **лік**
2. *Рысы, выраз твару. Агульны выгляд, сукупнасць адметных рыс, характэрных чаму-н. -* **абліччa**

1. *Ваза з каштоўнага матэрыялу, што ўручаецца пераможцу ў спартыўным спаборніцтве як прыз; пасудзіна невялікага аб'ёму, якая мае форму паўсферы, да якой далучана колцападобная «ручка» для трымання -* ***кубак***

2. *Вялікая, звычайна высокая чарка, пасудзіна для віна -* ***келіх***

1. *Называць грубымі, зневажальнымі, абразлівымі словамі; Ганьбіць, бэсціць; Дакараць, рабіць вымову -* ***лаяць***
2. *Падаваць адрывістыя гукі (пра сабаку, ліса і некаторых іншых звяроў); перан. знач. разм. слова Ілгаць, хлусіць, маніць; паклёпнічаць, нагаворваць -* ***брахаць***

1. Прылада для палення, якая складаецца з цыбука і галоўкі, пустой ўнутры, у якую насыпаюць тытунь - **люлька**

2. Плецены або драўляны дзіцячы ложак, які можна калыхаць, гушкаць - **калыска**

1. Прадмет дамашняга ўжытку для захоўвання і перавозкі сыпучых цел, дробных рэчаў, зроблены з тканіны, складзенай папалам і сшытай з двух бакоў - **мех**

2. Валасяное покрыва на целе жывёл; Выробленая шкура пушнога звера - **футра**